# СІНТАКСІС

## *СКЛАДАНЫ СКАЗ*



Магілёў 2021

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

метод. каб

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
імя А. А. КУЛЯШОВА"

# СІНТАКСІС

## *СКЛАДАНЫ СКАЗ*

Практыкум

*Складальнік*
С. В. Старавойтава

Магілёў
МДУ імя А. А. Куляшова
2021

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

УДК 811.161.3
ББК 81.411.3
С38

*Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета*
*МДУ імя А. А. Куляшова*

Рэцэнзент
выкладчык беларускай мовы
вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі
*А. В. Грышчанкова*

**Сінтаксіс. Складаны сказ** : практыкум / складальнік
С38 С. В. Старавойтава. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2021. – 44 с.
ISBN 978-985-568-829-8

Практыкум пабудаваны ў форме тэстаў, прадстаўленых у двух варыянтах, якія будуць садзейнічаць падрыхтоўцы навучэнцаў да цэнтралізаванага тэсціравання і з дапамогай якіх можна высветліць, наколькі паспяхова засвоены ключавыя пытанні раздзелу. Праверыць правільнасць выканання заданняў можна з дапамогай адказаў, змешчаных у канцы.

Адрасуецца старшакласнікам, абітурыентам, настаўнікам беларускай мовы.

**УДК 811.161.3**
**ББК 81.411.3**

**ISBN 978-985-568-829-8**

© Старавойтава С. В., складанне, 2021
© МДУ імя А. А. Куляшова, 2021

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# ПРАДМОВА

Выданне з'яўляецца працягам практыкума "Сінтаксіс. Просты сказ". Складаецца з чатырох частак: "Складаназлучаныя сказы", "Складаназалежныя сказы", "Бяззлучнікавыя сказы" і "Сказы з рознымі відамі сувязі". У практыкуме прадстаўлены тэставыя заданні, якія будуць садзейнічаць падрыхтоўцы навучэнцаў да цэнтралізаванага тэсціравання. У кожным заданні прапануецца пяць варыянтаў адказаў, з якіх правільнымі могуць быць толькі два або тры. Пры складанні заданняў улічвалася, пры вывучэнні якіх тэм у навучэнцаў узнікаюць цяжкасці.

Характар тэставых заданняў вызначаецца, як правіла, спецыфікай тэмы. Так, для замацавання ведаў па сінтаксісе прапануюцца складаныя сказы, з якіх трэба выбраць сказы пэўнага віду; заданні на вызначэнне колькасці прэдыкатыўных частак; у складаназалежных сказах вызначаецца месца дадзенай часткі, а таксама вялікая ўвага ўдзяляецца сродкам сувязі паміж часткамі і відам даданых частак. Значнае месца адводзіцца пастаноўцы знакаў прыпынку ў складаных сказах розных тыпаў, а таксама складанню схем сказаў. Маюць месца заданні, якія садзейнічаюць праверцы ведаў і па простым сказе.

Усе заданні сістэматызаваны. Тэсты прадстаўлены ў двух варыянтах, заданні ў якіх раўназначныя.

У якасці матэрыялаў для тэстаў выкарыстоўваліся сказы з твораў вядомых беларускіх пісьменнікаў.

Матэрыялы практыкума могуць быць выкарыстаны старшакласнікамі, абітурыентамі, выкладчыкамі беларускай мовы.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫЯ СКАЗЫ

**1. Адзначце нумары складаназлучаных сказаў (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Маці падала яму яшчэ кавалачак сала дадала некалькі ласкавых слоў і сэрца малога палагоднела ад гэтай дабраты.
2. Дзяўчына здалёк колькі разоў бачліва акідвала поглядам незнаёмага маладога хлопца а падышоўшы бліжэй апусціла вочы.
3. Настаўнік яшчэ доўга сядзеў ля акна і розныя думкі падымаліся ў яго галаве.
4. Амаль прыпаўшы тварам да агеньчыка нібы ў паклоне старалася вярнуць Ганна яму жыццё дзьмухала падтрымлівала а ён тлеў усё слабей.
5. Калі Васіль пад'ехаў да сенажаці Чарнушка ўжо выводзіў з аглабель распрэжанага каня.

***Варыянт 2***

1. І гэты ясны дзень і гэтыя краявіды поўныя паэзіі і гэтыя звесткі аб новым месцы сабраныя ў дарозе ўсё гэта паляпшала добры настрой настаўніка.
2. На зямлюляглі няроўныя цені і за мяжой святла яшчэ больш згусцілася цемра.
3. Ці то птушкі спяваюць ці то пераліваюцца журчаць ручаі пад вузлаватым карэннем соснаў.
4. Ужо адцвілі блакітам васількі і ў снапы кладзецца жытні колас.
5. Сойка належыць да чорнай птушынай сям'і куды залічаны таксама крумкач варона галка грак і сарока.

**2. Адзначце складаназлучаныя сказы са спалучальнымі злучнікамі:**

***Варыянт 1***

1. Ці абзавуцца ў небе гусі, ці дзяцел грукне па сасне.
2. Аблачыны сцелюцца пярынай, і туман ахінуў паплавы.
3. Шум лесу – гэта песні дрэў, а дрэвы пяюць і ў бязветраны дзень.
4. Яшчэ ад рання блінцы пякліся на сняданне, і ўжо пры печы з чапялою стаяла маці.
5. Няхай у кожнага будзе дом і ў кожным доме будзе ўтульнасць.

***Варыянт 2***

1. Ранак скончыўся, і чыстае сонейка выглянула з-за хмар.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Між аблокаў зманлівай скупой радасцю праглядвала восеньскае сонца, і шырокія імклівыя цені няспынным агромністым статкам хутка-хутка плылі па зямлі.

3. Сілачом стаіць дуб разложысты, і здалёк відаць пышны верх яго.

4. Я павёў вачыма, але нідзе не ўбачыў ляснога доктара.

5. Ці то птушкі змоўклі, ці то вецер пацішэў.

**3. Адзначце складаназлучаныя сказы з супастаўляльнымі злучнікамі:**

***Варыянт 1***

1. Не то самалёт у вышыні гудзе, не то машына нейкая грукоча.

2. Славік прыбавіў крок, потым павярнуўся, глянуў на Тараса, а той застаўся стаяць на тым баку дарогі.

3. Была нялёгкая работа, але была яна ў ахвоту.

4. Спрабавала птушка ўзляцець, але зноў падала на зямлю.

5. Пілаваў Максім спачатку нетаропка, але праз некаторы час ён захапіўся сваёй работай.

***Варыянт 2***

1. У лесе было цёпла, аднак лёгкі пах восені ўжо адчуваўся ў прыродзе.

2. Вяртанне цяпла ў кастрычніку бывае амаль кожны год і доўжыцца некалькі дзён, а то і тыдняў.

3. Ці то дождж шуміць за акном, ці то ўзняўся моцны вецер.

4. Маўчала возера ў тумане, ды вербы плакалі ў цішы.

5. Жаўранкаў не відаць у цьмяным небе, а толькі песня звініць, цярушыцца на траву, на кветкі.

**4. Адзначце складаназлучаныя сказы з размеркавальнымі злучнікамі:**

***Варыянт 1***

1. Ці зараз паедзем на гэтым аўтобусе, ці доўга прыйдзецца чакаць наступны.

2. Або птушак там не было, або яны проста не адважваліся падаваць голасу.

3. Спачатку зацвілі вішні і грушы, а потым сад напоўнілі водарам яблыні.

4. З дрэў асыпалася апошняя лістота, і яе суцэльны рознакаляровы дыван густа ўкрывае адсырэлую зямлю.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. Чуваць ці то птушыны шчэбет-перасвіст, ці то веснавое булькане крыніц.

***Варыянт 2***

1. Не было ўжо бесклапотнасці, але была надзея, таксама цвярозая, пэўная.

2. Не то дзесьці іграе музыка, не то хтосьці спявае.

3. Або яшчэ зусім рана, або сёння будзе пахмурнае надвор'е.

4. Вучацца птушкі лятаць строем у пэўным парадку, робяць розныя манеўры, нечаканыя крутыя павароты то ў адзін, то ў другі бок.

5. Меншымі становяцца дні, і нізіны, вадаёмы раніцай хавае туман.

**5. Адзначце складаназлучаныя сказы, у якіх тры прэдыкатыўныя часткі (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Сінія зігзагі бліскавіц імкліва разразалі чорную хмару але нарэшце грымоты пачалі аддаляцца.

2. Дразды пырхалі і цокала недзе ў вершаліне вавёрка а на поплаве перад самай ракою сінела на траве мноства павуцінных сецяў.

3. Міця зрабіў да ласіхі крок і яна тут жа павярнула назад пайшла ў драбналессе на высечках.

4. З поўдня балоты зноў падбіраліся да саламяных радоў стрэх але ў гэты бок ішла большая сувязь са светам і тут па дрыгве была намошчана дарожка.

5. Сонца пачынала прыпякаць і мацней пачыналі адчувацца пахі лесу а з нізін ужо не цягнула халадком.

***Варыянт 2***

1. Збочыш на сцежку са шляху пройдзеш крыху ўперад і ўжо за табой схавалася дарога і ты адзін сярод густой збажыны задраўшы галаву ўгору глядзіш на каласы.

2. Ласяня тапталася на цыбатых ножках спрабавала выбрацца з ямы але гэта яму не ўдавалася.

3. На вышэйшых мясцінах трапляласа многа жоўтых лісічак і неўзабаве вёдры ў хлопцаў былі напоўнены імі амаль напалавіну.

4. Цягнік мякка падкаціўся да станцыі і пасажыры замітусіліся забразгалі вёдрамі.

5. Так ён пакутаваў у дрымоце доўга і сон тым часам пачаў адступаць а розум патроху абуджацца і завалодваць стомленым целам.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**6. Адзначце нумары складаназлучаных сказаў, у якіх паміж часткамі трэба паставіць коску:**

***Варыянт 1***

1. Зрабі крок і дарога паявіцца сама сабой.

2. Вада адразу нібыта ўспыхвае каляровай вясёлкай і плынь паціху гайдае адбіткі агнёў.

3. Сашы было не да хараства аднак і яна звярнула ўвагу на гэты цуд прыроды.

4. Навокал адно гніла куп'істая дрыгва ды моклі панурыя лясы.

5. Усім патрэбна было жыллё і кожны стараўся як мага хутчэй адбудавацца.

***Варыянт 2***

1. Камлі дрэў часам сунуліся паўз самыя драбінкі і маці перасцярожліва схавала ногі ў воз.

2. Яшчэ тыдзень-другі і на змену дажджу пасыплецца снег.

3. Ужо лотаць зжаўцела ля ракі і засінелі пралескі на ўзлеску.

4. Галаву сойкі ўпрыгожвае натапыраны чубок а пад вачыма блішчаць чорныя лапікі.

5. Гэта надало Валодзьку порсткасці і ён яшчэ смялей кінуўся за калёсамі.

**7. Адзначце нумары складаназлучаных сказаў, у якіх паміж часткамі знакі прыпынку не ставяцца:**

***Варыянт 1***

1. Спеў жаваранка і куванне зязюлі.

2. Адкуль яна і чаго яна хоча ад нас?

3. Снежная бель адбірала вочы і на сэрцы ад гэтага рабілася светла і радасна.

4. Юрка вучыўся ў пятым класе а Валерка яшчэ зусім не хадзіў у школу.

5. Над Белай Руссю іграюць гуслі і песні-лебедзі ляцяць.

***Варыянт 2***

1. Якое гэта жыццё і якая гэта сям'я без дзяцей?

2. У недалёкай нізінцы стаяла ранішняя ціш і вісеў бела-блакітны туман.

3. Крынічкі звон і лесу пошум.

4. Расінкі дрыжаць на асіне ды падаюць зоры ў раку.

5. Васіль тузануў лейцамі Гуза і калёсы паволі пакаціліся па двары на вуліцу.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**8. Адзначце нумары складаназлучаных сказаў, паміж часткамі якіх трэба паставіць працяжнік:**

***Варыянт 1***

1. Яшчэ хвіліна і наваколле поўніцца рознагалосым птушыным спевам.

2. Не бачым мы ў садах зноў шпакоў і даўно ўжо не чутны там спевы салаўёў.

3. Варта толькі пайсці снегу і працы ў полі не будзе.

4. Знойдзеш пяць ці шэсць баравікоў і палавіна кошыка.

5. Міналі дні за днямі і ў старога дзятла вывеліся птушаняты.

***Варыянт 2***

1. На крылах цёплых вятроў прылятала з-за мора зялёная вясна-чараўніца і лясы першыя дружна адгукаліся на яе малады покліч.

2. Яшчэ некалькі дзён і снегу нідзе не будзе.

3. Дыхнула поле водарам вясновым і я адчуў сябе ў вёсцы, дома.

4. Узмах крылаў і бусел свабодна лятае над ліпай.

5. Дарога нечакана вывела мядзведзіцу з лесу і з узгорка яна ўбачыла вёску.

**9. Адзначце нумары складаназлучаных сказаў, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

***Варыянт 1***

1. Крануў марозік журавіны, і сталі ягады салодкімі.

2. Па зямлі прайшлося сонца цёплымі праме́нямі, а вясна ўслед пралескі рассыпала жменямі.

3. У сяле яшчэ доўга гучалі песні, ды чуўся брэх патрывожанага сабакі.

4. То іней асыпаецца на скронь, то хвошча лес іглiцаю і снегам.

5. Больш за тысячу відаў птушак знаходзіцца пад пагрозай знікнення, і пагроза гэта для большасці з іх узрастае з кожным днём.

***Варыянт 2***

1. То вяршыні ліп палыхалі мядзяным бляскам, то сады ружавелі і дыміліся празрыстым туманам.

2. Дождж лінуў, і ў адзін міг салаўіны гай прыціх.

3. На дубе адвечным месяца ражок вісіць, а побач ад холаду асенняга зорка-іскарка дрыжыць.

4. Перад навальніцай лісце паўднёвай акацыі нікне, і яе ружовыя кветкі згортваюцца.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. Чалавеку больш за ўсё часам патрэбна добрае слова, і слова гэта сапраўды часта ратуе лепш за лекі.

**10. Адзначце нумары складаназлучаных сказаў, у якіх знакі прыпынку пастаўлены няправільна:**

***Варыянт 1***

1. Часам зорка ўначы на яго кіне зрок і хмурынка не раз зазірне ў ручаёк.
2. Зноў ландышаў званочкі зазвінелі, і вабіць пахам дзіўны дзівасіл.
3. Гукну – і бор цяністы адкажа мне рэхам.
4. Як міла гаманіла лета на мове зор малінавых і кветак, і якім дзівосным водарам яно плыло па свеце!
5. Ці то ў хаце нікога не было, ці то ніхто не пачуў нашага стуку.

***Варыянт 2***

1. Як апантана любяць працу мае тата і дзядуля, і колькі руплівасці ў кожнай справе маёй мамы і бабулі!
2. Зойдуць сябры ў хату – і хата стане святлейшая.
3. Верасы не жнуць, не косяць, не рвуць, як кветкі, але першы месяц восені называецца ў беларусаў верасень.
4. У небе месяц выплыў на папас, і ціха зоркі расцвілі.
5. Свой колас схіліўшы, спяць нівы бязмежныя ды ледзь чутна шумяць сасднякі прыбярэжныя.

**11. Адзначце нумары складаназлучаных сказаў, у якіх адна з прэдыкатыўных частак ўскладненая (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Ідзеш па сцежцы ў панурым восеньскім лесе і раптам паміж дрэў штосьці мільгане кавалачкам сакавіцкага неба.
2. З-за павароту ён зноў убачыў наперадзе Чарнушкавы калёсы белую Ганніну хустачку і думкі яго вярнуліся к дзяўчыне.
3. Хведзька прысеўшы наўколенцы штосьці зацікаўлена разглядаў у траве а Ганна перакладвала пад калёсы біклажку.
4. У час каляднага марозу то стагналі сосны ўночы то сварыўся дуб мажны.
5. Люба слухаць той спеў несціханы густы і пад песні яго адпачынеш і ты.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт 2***

1. У вольны час ён браў з сабой сяброў сядаў за вёслы і яны з песнямі выплывалі на дняпроўскі прастор.

2. У жнівеньскі дзень вуліца дрэмле затое поле поўніцца жыццём.

3. Журавель прылятае на праталіну а шпак вяртаецца на прагаліну.

4. Ён знарок не паглядзеў на Ганну але і не пазіраючы на яе Васіль адчуваў сябе ў поўнай меры шчаслівым.

5. Нагінаюць ніц галовы ў росах чыстых васількі і здаецца шэпчуць словы лозы ля ракі.

**12. Адзначце нумары складаназлучаных сказаў, у якіх адна з прэдыкатыўных частак – аднасастаўны сказ (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Задумаўся хлопец не асцярогся і каса знянацку з усяго маху ўрэзалася ў нешта цвёрдае.

2. Недзе далёка на ўсходзе крыху абазначылася святло на небе але была яшчэ ноч кароткая летняя.

3. Шмат ёсць розных пахаў і ўсё ж ім не зраўняцца з водарам весніх палёў лугавін ды сенажацяў.

4. Пачуўшы сына маці не азіраючыся стала завіхацца хутчэй і Васілю ад гэтага маўклівага знаку матчынай увагі і пашаны да яго стала весялей.

5. Маці закрыла хусткай ледзь не ўвесь твар падкурчыла ногі але ратунку ад камароў і так не было.

***Варыянт 2***

1. Прайшоў невялікі дожджык але вось толькі цяпер пад вечар крыху пасвяжэла.

2. Адзін і пры месяцы робіць а другі і пры сонцы спіць.

3. Залатым лістападам асыплецца бяроза і скінуць свой багаты ўбор ліпы і клёны.

4. З пілой і сякерай чалавек пагражаў лясным дзялянкам і лесніку нялёгка было справіцца з парубшчыкамі.

5. Холадна было б нам у зялёнай і мокрай пустыні ды ў нас ёсць вогнішча.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫЯ СКАЗЫ

**1. Адзначце складаназалежныя сказы (знакі прыпынку паміж часткамі не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Нас маладосць адорвае каханнем і каханне нас вяртае ў маладосць.

2. Пасля поля тут было ад гушчыні маўклівых, нібы прытоеных, хмурных хваін цемнавата і сыра хоць лясок і рос на пясчаніку.

3. У канцы сакавіка на шэры снег, на дрэвы, на каржакаватую сасну лёг густы, жывы, цёплы туман.

4. Сюды сышоўся амаль увесь канец вёскі каб паглядзець на медзведзянят.

5. Ляснік падышоў да акна і на момант задумаўся, а потым прапанаваў адпусціць зверанят да маці бо яна вельмі гаруе.

***Варыянт 2***

1. Сонца ўвайшло ў сілу і пачало прыпякаць хоць і хавалася час ад часу за белымі аблокамі.

2. Сядзіць малады дзяцел ды думае каб бацькі прынеслі яму якоганебудзь жучка.

3. Мы разумеем гэту адказнасць, гэты высокі давер Радзімы, стараемся ўсімі сваімі сіламі, вопытам і ведамі апраўдаць яго.

4. Станіслаў мог гадзінамі стаяць і, нібы зачараваны, слухаць шолахі лесу бо чуў у іх лясныя радасці і трывогі.

5. Даспявала збажына і ласкавы гул коласа не змаўкаў ні на хвіліну.

**2. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх даданая частка стаіць перад галоўнай (знакі прыпынку паміж часткамі не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Неўзабаве перад ім пачалася вузкая, метра на паўтара, палоска чыстай вады над якою нахілілася асака.

2. Дзе сосны растуць высокія па-над рэчкай гаманліваю нас буслы радуюць клёкатам, прыляцеўшы з далёкага выраю.

3. Хто з птушак не пакідаў лес той рыхтаваўся да зімы.

4. Каб неяк стрымаць хуткае распаўсюджванне ваўкоў паляўнічым выплочвалі грашовыя ўзнагароды за кожную здадзеную шкуру ваўка.

5. Калёсы на якіх сядзелі Васіль і маці ўжо ўязджалі ў лес.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт 2***

1. Стары бабёр ішоў павольна бо хадзіць бабры не любяць і не ўмеюць.

2. Як толькі сакавіцкае сонца сагрэе пагоркі на палях снег на іх хутка растае.

3. У каго запас ежы быў у кладоўцы таму мароз не страшны.

4. Пад нагамі шабуршыць мінулагодняе лісце па якім гуляюць залацістыя бліскаўкі-зайчыкі.

5. Калі дарога пачала пераходзіць у вузкую сцяжынку лес стаў гусцейшым.

**3. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх дадапая частка стаіць пасля галоўпай (знакі прыпынку паміж часткамі не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Касіў ён цяпер асцярожна, сачыў за куп'ём якое пачынала трапляцца ўсё часцей і часцей.

2. А калі там раптам па-восеньску жоўта і ўрачыста засвецяцца гаі і дубровы пад кожнаю бярозкай абавязкова прарэжацца падбярозавік.

3. А маці ўжо даўно ўстала і асцярожна каб не разбудзіць тупае па хаце.

4. Адразу ж стала няёмка што я так дрэнна падумаў пра незнаёмых людзей.

5. Хваляванне адразу ж пакінула Паліну як толькі яна пачала знаёміцца з вучнямі, выклікаць іх па спісе.

***Варыянт 2***

1. У цішыні пачулася як мякка і глуха ўдарылі па цёплым дарожным пыле першыя кроплі.

2. Потым Сяргей выбіўся на лясную дарогу якую абступалі высокія бярозы і пайшоў дадому.

3. Яго заўсёды прыемна ўражвала што кожны раз навальніца пачыналася па-свойму.

4. Бацька спрытна паклаў у сярэдзіну круга кавалак гліны з якой будзе донца гаршка а потым пачаў выкругляць сценкі.

5. Калі Выгоцкі блукаў ад вёскі да вёскі па раёнах сэрца балела ад выгляду родных паселішчаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**4. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх дадаая частка стаіць у сярэдзіне галоўнай (знакі прыпынку паміж часткамі не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Неўзабаве вавёрка пачала прыкмячаць што ў яе кладоўцы ўсё менш і менш становіцца запасаў.

2. Ад намоклай тканіны ногі першы час пакуль не прывык крыху непрыемна казытала.

3. Галасоў птушак што так звінелі на ўскраіне цяпер амаль не было чуваць.

4. Каб трапіць да моста трэба было зайсці з другога боку.

5. Сярод дрэў што растуць на нашай зямлі дуб займае пачэснае месца.

***Варыянт 2***

1. Зрабіўшы невялікі круг каб адгадаць загадку я абышоў сасну і тут убачыў птушку.

2. За палянай дзе пачынаецца белая грэчка стаялі чатыры ліпы-красуні.

3. Пакуль іграла скрыпка вакол нічога не існавала: ні зямлі, ні неба, ні вуліцы, ні яго самога.

4. Аднойчы на Дняпры здарыўся з Алегам такі выпадак які вельмі напалохаў маці і бабулю.

5. Хлопец успомніў што дзесьці тут была сцяжынка і пачаў хадзіць каля кустоў.

**5. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх правільна выдзелена галоўная частка (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Калі настала зіма і ў лесе не было ніводнага зялёнага лісціка ніводнай кветачкі *ішла гэтай самай дарогай* каля якой расла каліна *жанчына з маленькім хлопчыкам.*

2. *На процілеглым баку даліны раскінуліся палеткі вузкія палоскі ўзгоркаватай зямлі занямонскіх сялян* дзе туліліся закрытыя пагоркамі невялікія вёскі якія мелі агульную назву Сёлы.

3. *Тады ён не ведаў* што такое Верхань і не думаў што праз шэсць месяцаў зноў давядзецца быць на гэтай жа станцыі каб пачаць нейкую новую для яго дарогу.

4. *Часамі на перавалах* дзе разводдзе бушавала з нястрымнаю сілай і кідала лодку як трэску *прыходзілася налягаць на ўсю змогу на вясло* каб выбрацца з небяспечных віроў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. *Сцяпан помніў* што дзесьці тут ля бяроз павінна быць крынічка з якой можна ўзяць вады і пачаў шукаць тры бярозы.

***Варыянт 2***

1. *Потым ён выбіўся на лясную дарогу* якую абступілі высокія бярозы і якая вяла да сяла і пайшоў дадому.

2. *Учэпістыя дубкі* што раслі на схіле пагорка *таксама непрыхільна паглядалі на маладую каліну* якая зусім не звяртала на іх увагі.

3. Тое што спачатку ўяўлялася Лабановічу вялікай радасцю ўдачаю *потым сталася для яго крыніцаю вялікага клопату і згрызот.*

4. *Пасля гэтага Лабановіч дзвюма рукамі падняў галіну ўгору і стаў махаць ёю ў свой бок даючы гэтым знак* каб Янка сыходзіў з кургана і накіроўваўся да грэблі што пачыналася зараз жа за Нёманам насупраць Мікуціч і пралягала праз усю нёманскую даліну.

5. Вось калі б я зрабіў злачынства людзям простым людзям *дык тады можна было б адвярнуцца ад мяне* хоць я і ваш родны сын.

**6. Адзначце складаназалежныя сказы, прэдыкатыўныя часткі якіх звязаны пры дапамозе злучальных слоў:**

***Варыянт 1***

1. І тады здаецца, што па рацэ плыве дзівосны карабель.

2. Алешнік вельмі часта мяшаўся з лазняком, што рос моцнымі дружнымі купамі, уздымаючы ў лясны прыцемак шызыя кучары пераплеценага галля.

3. Светлы бор заканчваецца пасадкамі маладых сасоннікаў, што цягнуцца на вярсты тры-чатыры.

4. Ішоў важка, павольна, цягнучы ногі, што хлюпалі ў цёплай вадзе.

5. Па агні маяка на высокім правым беразе хлопчык прыкмеціў, што яго лодку занесла далёка супраць цячэння.

***Варыянт 2***

1. Пайшоў па ледзь прыкметнай сцежцы і ўзрадаваўся, прыкмеціўшы знаёмыя бярозкі, што раслі нібы з аднаго кораня.

2. Маці верыла яму і была ўпэўнена, што яе спрытны і кемлівы сын не трапіць у бяду.

3. Дзяўчынка сказала, што навучыць сароку гаварыць.

4. У лесе буяла мноства злой лясной крапівы, што дзе-нідзе ўздымалася загонамі ў чалавечы рост.

5. Тут я ўбачыў сойку, што скакала з дрэва на дрэва і, як звычайна, тарахцела на ўсё наваколле.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

**7. Адзначце складаназалежныя сказы, прэдыкатыўныя часткі якіх звязаны пры дапамозе злучнікаў:**

***Варыянт 1***

1. Затое ўранні Зазыбу ўразіла, што зусім не зглядвалася ў Верамейках адзнакаў чалавечага жытла.

2. Усё пачалося з таго, што Валодзю выбралі старастам класа.

3. Васіль заўважыў, што дзядзька Цімох таксама пачаў павольна махаць касой.

4. Недзе ў пятым класе, вяртаючыся са школы, каля кінутай хаты я выкапаў корчык маліннiку і пасадзіў ля плота, што падзяляў наш двор з дваром дзядзькі Ігната.

5. З купіны зручна жораву наглядаць за ўсім, што робіцца на балоце.

***Варыянт 2***

1. Засвоілі птушаняты ўсё тое, што маладому жораву трэба ведаць у першую чаргу.

2. І мы як быццам схамянуліся, убачылі, што з намі ёсць маленькі чалавек.

3. Медзведзяняты прачнуліся і ўбачылі, што няма іх маці.

4. На балоце там і тут кучаравіліся кусты лазы, што дзе-нідзе зрасталіся ў цэлыя астраўкі.

5. Вавёрка лічыць не ўмела, але на вока прыкінула, што столькі з’есці яна адна не магла.

**8. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх падкрэсленыя словы з’яўляюцца злучнікамі:**

***Варыянт 1***

1. Так у хаце Луцэвічаў з’явіўся новы чалавек, які стаў першым памочнікам бацькі і лепшым сябрам Янкі.

2. Чымсьці блізкім, родным патыхала на Лабановіча, калі ён аглядаў двор, будынкі і ўбогі скарб нескладанай сялянскай гаспадаркі, дзе кожная рэч нагадвала далёкае, бестурботнае маленства.

3. А цяпер Лабановіч у гэткім становішчы, што такой дапамогі аказаць не можа, хопь яна вельмі патрэбна.

4. Лабановіч шпарка накіраваўся ў сяло, каб узяць лодку і плысці да Янкі.

5. Саматужная школа ў Смалярні абмежавала час Лабановіча, што нікольки не турбавала яго, бо гэта была жывая і прывычная яму справа.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт 2***

1. Без грыбоў ён ніколі не вяртаўся, бо добра ведаў, памятаў мясціны, дзе збіраў іх раней і якія паказаў яму бацька.

2. Сцяпан рашыў не траціць дарма часу і накіраваўся ў бярэзнік, які высока і роўна падняўся за гарой.

3. Янка ўхапіўся за нос лодкі і пацягнуў яе так, каб можна было зручна апынуцца ў ёй.

4. Узыходзячы на самую макушку Дзям'янавага Гуза, Янка трымаў добра прыметны саматужны сцяг, хоць адлегласць паміж сябрамі была не меней вярсты.

5. На ўскрайку лесу Лабановіч прыпыніўся і акінуў вокам Смалярню, двор і хату, невялічкі садок, дзе ўжо збіралася зацвітаць маладая дзікая грушка.

**9. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх выдзеленыя курсівам словы з'яўляюцца злучнікамі:**

***Варыянт 1***

1. Ходзяць бабры толькі тады, *калі* няма ўжо другога выйсця.

2. Паліна добра памятае той дзень, *калі* яна ўпершыню ўбачыла сваіх вучняў.

3. Кожны раз замірае сэрца, *калі* пад ядлоўцам або пад лапкамі маладых елачак мільгане раптам карычневы капялюшык баравіка.

4. Мы дакладна не ведалі, *калі* павінна прыехаць машына са збожжам.

5. *Калі* я падняўся з пня і зрабіў некалькі крокаў да птушак, сарокі закрычалі.

***Варыянт 2***

1. Звярнула хмурынка на сябе ўвагу, *калі* пачала ўвачавідкі шырыцца, расці і гусцець.

2. Асабліва нялёгка даводзіцца маладым жураўлям, *калі* ў іх адрастуць крылы.

3. Мала выпадала такіх начэй, *калі* можна было паспаць па-людску.

4. *Калі* запальваюцца агні, высокія вокны, дах так і зіхацяць ад электрычнага святла.

5. *Калі* пачнецца наступленне, ніхто не думаў.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**10. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх курсівам выдзелены злучальныя словы:**

***Варыянт 1***

1. Дом толькі тады жывы, *калі* ў ім жыве гаспадар.
2. На сходзе вырашалі пытанне аб тым, *калі* пойдзем у лес за дрэўцамі.
3. У той дзень, *калі* пайшоў снег, хлопцы засталіся дома.
4. *Калі* я наведваю сваіх дзяцей і ўнукаў, то абавязкова вязу ім апельсіны.
5. Аднойчы, *калі* мы з братам пасвілі статак кароў, Толя, на маю вялікую радасць, напрасіўся памагаць нам.

***Варыянт 2***

1. У тую ноч, *калі* была моцная навальніца, у суседняй вёсцы згарэла хата.
2. Назаўтра, *калі* яшчэ сонца не ўзышло, хлопцы выйшлі з дому і накіраваліся ў лес.
3. *Калі* дзяўчынка прыходзіла са школы, сарока падскоквала, узмахвала крыламі і прасіла есці.
4. *Калі* месяц падняўся і пабялеў, можна было ўбачыць на поплаве нейкія цёмныя лапіны.
5. Мы дамовіліся, *калі* будзем заўтра выходзіць з дому.

**11. Адзначце складаназалежныя сказы з дадзенымі дзейнікавымі часткамі:**

***Варыянт 1***

1. І ясна мне стала, што нельга ў нашым становішчы губляць час.
2. Раптам наперадзе я заўважыў, як нешта шэрае павольна рухаецца за кустамі арэшніку.
3. Хто рупіцца і працуе, ураджай збярэ.
4. Ласіха часта выходзіла на край лесапасадкі і ўсё глядзела ў бок канюшні, чуючы, што там яе малое.
5. Мужчыны расказалі, што з гэтага месца аднойчы пачулі крыкі аб дапамозе.

***Варыянт 2***

1. Некаторы час было чуваць, як нешта шамаціць і трашчыць.
2. Было ўсім зразумела, што ласяня да берага не даплыве.
3. Падумаўшы, што хлопцы пайшлі ў лес або на рыбалку, Фомка памчаўся за імі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Антон захацеў пабачыць, дзе ж пасадзілі маладыя дубкі.

5. Тут калісьці ў верасні бачылі мы, як кацілася знічка з нябёс.

**12. Адзначце складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі месца:**

***Варыянт 1***

1. У птушаняці з'явілася ўлюбёнае месца на буфеце, дзе яно спала на адной лапцы.
2. У выхадныя дні тата вывозіў усю сям'ю ў лес, дзе дарослыя збіралі грыбы і ягады.
3. Не задаволіўшыся хаткаю, бабрыха выкапала сабе яшчэ і нару ў кутку памяшкання, дзе была зямля.
4. Там, куды пайшла штурмавая група, было ціха.
5. Дзе дарогі з берага сыходзіліся ў адну, брыгадзе давялося спыніцца.

***Варыянт 2***

1. Там, дзе цячэ Бяроза ціха, абудзіць поўначчу прастор хрыпатым голасам ласіха.
2. За сасоннікам пачыналася чарналессе, куды я і трымаў кірунак.
3. Пакінуўшы веласіпед каля дарогі, бацька з сынам накіраваліся да высокага дуба, дзе было гняздо чорных буслоў.
4. Некаторыя жывёлы своечасова не адчулі небяспеку і засталіся на гэтых хілых узгорачках, дзе нават і схавацца няма дзе.
5. Дзе зараснікі чаромхі і крушыны, аднойчы трапіла лісіца ў пастку.

**13. Адзначце складаназалежныя сказы з даданымі акалічнаснымі ўмовы:**

***Варыянт 1***

1. Праца становіцца выхавацелем, калі яна арганічна ўваходзіць у духоўнае жыццё дзіцяці.
2. Аднойчы вечарам, калі ўжо добра сцямнела, Максім пачуў ціхі стук у акно.
3. Калі Клара вырасла, узніклі непрадбачаныя цяжкасці.
4. Калі маё не ў лад, то я са сваім назад.
5. Калі я схаваўся за высокаю сасною і пачаў назіраць, чарапаха высунула сваю маленькую галаву з-пад панцыра.

***Варыянт 2***

1. Калі Валерык выйшаў з хаты, хмара была ўжо далёка над лесам.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Не кожнае дрэўца выжывае, калі яго не так перасадзіць.

3. Быў надта б рад, каб хоць зярняткам дробным мог на зямлі бацькоўскай прарасці.

4. Як толькі спуталі коней, падлеткі пачалі раскладваць агонь.

5. Ледзь ссунуўся з пагоркаў і праталін у раўчукі і балоты снег, лінулі дажджы, цёплыя, па-вясноваму імклівыя, спорныя.

**14. Адзначце складаназалежныя сказы з дадзенымі акалічнаснымі мэты:**

***Варыянт 1***

1. Многія з нас выкарыстоўваюць свой вольны час, каб быць бліжэй да прыроды.

2. Пахваліцца было чым, бо многія з рабочых выканалі свае планы.

3. Міша так і не пагаварыў з сябрам, таму што той увесь час быў нечым заняты.

4. Будзем падмуркі і цэглу мы класці, каб на зямлі людзі зведалі шчасце.

5. Я быў здзіўлены, бо чмялі так позна збіралі мёд.

***Варыянт 2***

1. Хлопцы пачалі дапамагаць сябру, бо ў яго нічога не атрымлівалася.

2. Каб ні з кім не сустракацца, Васіль пайшоў па сцежцы праз агароды.

3. Да нябёс уздымае зямля каласы сваіх ніў, каб сагрэла іх сонца.

4. У Толіка быў радасны настрой, бо ён сёння пойдзе на вакзал, купіць білет і паедзе дадому.

5. На ўскраіне горада наша машына спынілася, таму што сталі пярэднія.

**15. Адзначце складаназалежныя сказы, часткі якіх звязаны і злучнікам, і злучальным словам:**

***Варыянт 1***

1. Часам да чалавека прыходзіць такое імгненне, калі нясцерпна хочацца пабачыць тыя мясціны, дзе калісьці хадзіў у маленстве.

2. Была ўжо, пэўна, позняя восень, бо добра памятаю, што ў тую раніцу сыпаў калючы сняжок.

3. Чалавек выбраў для купання месца, дзе, як яму здалося, будзе па шыю, скокнуў у ваду і захлынуўся ад нечаканасці, бо тут было метры два з паловаю.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Міхаську здаецца, што на ўсёй зямлі няма чалавека, які быў бы лепшым за гэту жанчыну ў белым бальнічным халаце.

5. Спачатку здалося, што ў прыбярэжных за ракою кустах лазнякоў і чаромхі гулка адазваўся салавей, які не адну вясну радаваў сваім голасам.

***Варыянт 2***

1. З расказа егера я зразумеў, што розныя мядзведзі жывуць у лесе, у якім мы блукалі не адзін дзень.

2. У познюю восень ці ў пачатку зімы небяспечны стары мядзведзь, які яшчэ не лёг спаць на зіму, бо не знайшоў сабе зручнага месца для спячкі.

3. Кожны жораў стараецца не парушыць строю, не збіцца з курсу, з нябачнай сцежкі ў паветры, якую пракладвае той, што ляціць перад ім.

4. Заварушыліся мурашкі, разнастайныя жучкі, кузуркі, такія малюсенькія, што трэба ўважна прыглядацца, каб заўважыць іх радасны мітуслівы рух на кожным куточку зямлі, абагрэтым сонцам.

5. Бачу, што ад лесу ў мой бок ляцяць буслы, якія, не даляцеўшы да Нёмана, селі на лугавым грудку.

**16. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх адна з прэдыкатыўных частак – ускладнены сказ (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Тое што ўсё на свеце з'яўляецца ў руху даказаў Галілей.

2. Пад густым шатром дубовай лістоты праз якую ледзьве прабіваліся сонечныя праменні вырашыў трохі адпачыць.

3. Убаку дзе дарога падступала к зараснікам нібы падфарбаваны жаўцеў яшчэ новы масток.

4. Сырыя вятры доўгай восені якія надакучліва шумелі ў голлі бярозы і секлі мне ў твар кроплямі дажджу сёння змоўклі.

5. Ён ішоў доўга прадзіраючыся праз густыя зараснікі лубіну якім было засеяна поле.

***Варыянт 2***

1. Ніколі яшчэ не было такога каб ён пайшоў з дому не папярэдзіўшы маці.

2. Убачыць зблізку жураўлёў няпроста бо яны жывуць на глухіх балотах.

3. Мядзведзіца пацягнулася раз-другі пазяхнула і асцярожна каб не разбудзіць сваіх маленькіх дзяцей вылезла з бярлогі прыслухалася.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Многія дні людзі жылі як на плыце які злая нягода занесла ў мора.

5. Алег любіў сваё мястэчка бо паблізу працякала магутная рака Дняпро.

**17. Адзначце нумары складаназалежных сказаў, у якіх чатыры прэдыкатыўныя часткі (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Калі птушаняты праклюнуцца і падужэюць бацькі вучаць іх знаходзіць пад мохам чарвякоў жучкоў лавіць у вадзе жабак іншую дробную вадзяную жыўнасць паказваюць як лаўчэй скакаць з купіны на купіну.

2. У такі час з хаты недалёка ад той дзе дзяўчына брала ваду выйшаў на ганак пацягваючыся хлопец з хмурнымі заспанымі вачыма з калматай ні то русявай ні то цёмнай чупрынай.

3. Аднастайныя нудныя дажджы што месяцамі лілі на мокрыя стрэхі сцюдзёныя вятры што люта білі ў замёрзлыя вочкі-шыбы завеямі цёплае сонца што ўставала ў пагодныя дні над купамі алешніку ўсё бачыла гэты востраў у штодзённай руплівасці.

4. Убачыўшы як дзядзька ідзе ўспомніў што галоўнае пры касьбе не спяшацца не высільвацца каб не змарыцца да пары.

5. Раніцай мы з Аляшкевічам дамовіліся што паплывём увечары на лодцы па Бярэзіне да возера Палік паглядзець як працуюць бабры.

***Варыянт 2***

1. Лес зрэдку разрываўся невялічкімі палянкамі на якіх рунела жыта а па краях там-сям пападаліся старадрэвіны-хвоі што пышна разрасліся на прасторы.

2. Спачатку было чуваць як у прыдарожнай вёсцы якую яны толькі што мінулі залопалі крыллем закудахталі куры як зарыпелі вароты загрукалі дзверы загаманілі людзі.

3. Мінуўшы лагчыну дзе моцна пахла ігліцай мохам і грыбамі сябры выйшлі на вялікую прагаліну парослую светла-зялёным чарнічнікам.

4. Уражаны міжволі спынішся і засмяешся калі зразумееш што гэта не сонца а мільганула люстэрка на крыле сойкі.

5. Сотнямі знаёмых вачэй зірнуў хутарок на Лабановіча зірнуў здавалася дакорліва бо ён забыўся аб гэтай беднасці аб гэтай пустэчы заняты сабою сваімі думкамі хоць яшчэ летась меркавалі яны з дзядзькам Марцінам аб тым каб завесці тут садок.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**18. Адзначце складаназалежныя сказы з сузалежным аднародным падпарадкаваннем (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Трэба ведаць чым быў слаўны наш край і што было на нашай зямлі да нас.

2. Каб запісаць нешта вышэй трэба было падстаўляць маленькі слончык які спецыяльна для мяне прынесла аднекуль настаўніца.

3. Я люблю пазіраць туды дзе шумяць каласамі шырокія нівы або рассцілаюцца бясконцыя зялёныя лугі.

4. Калі яна была побач радасць шырокая бязмежная жыла ў ім ва ўсім што акружала іх.

5. Юнацкая душа мая пратэставала што столькі людзей гіне льецца столькі крыві з-за такіх нізкіх чалавечых пачуццяў.

***Варыянт 2***

1. Чуваць было як свішча вецер у коміне і гуляе па вуліцы мяцеліца.

2. Душа напаўняецца песняй натхнёнай калі абуджаюцца кветкі ад сну і калі жаўранак першы над рунню зялёнай світальным званочкам вітае вясну.

3. Выйшаў я на сцежку што вяла да Свіслачы мінуў густы вішняк і апынуўся ў лагчыне дзе рос альшэўнік.

4. Ля колішняга панскага маёнтка ад якога засталіся толькі прыгожыя прысады выязджаем на сцяжынку што вядзе на ўзгорак з маладым хвойнікам.

5. Дзяўчына потым доўга расказвала бацьку як яны хутка імчаліся па полі а з-пад капытоў каня ляцеў іскрысты снег.

**19. Адзначце складаназалежныя сказы з сузалежным неаднародным падпарадкаваннем (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Той хто клапоціцца аб захаванні прыроды павінен ведаць што грыбы лепш за ўсё нізка зразаць.

2. Агеньчык быў такі немачны што не мог запаліць нават жмутак сухога сена які трымала над ім дзяўчына.

3. Толькі калі Раўбіч адвёў вочы Алесь заўважыў якая на ім дзівосная вопратка.

4. Шкада мне сцежак вечаровых што ў бор праз туманы плылі і кветкі купальскай чароўнай якую мы ўсё ж не знайшлі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. Глядзелі як асядае чарнее вадзяніцца снег як цурчаць пераліваюцца сонечнымі зайчыкамі ручаіны.

***Варыянт 2***

1. Хлопец прыгадаў як сёння ўцякаў ад прафесара і даў сабе слова што туды ён больш ніколі не пойдзе.

2. Павярнуў галаву ў той бок куды глядзела Вяслава і ўбачыў вялікую хмару якая цямнелася над далекаватым лесам.

3. Вітаю бярозы якія ў зіму чарадою брыдуць і тыя вятры штармавыя што мне несціхана гудуць.

4. Ён абраў тут зручную мясціну пуці дзе скончыўся насып што пралёг па голай балацявіне.

5. Калі ж пабляднее золак і цёмнай зробіцца вада заззяе серабром іголак зор грамада.

**20. Адзначце складаназалежныя сказы з паслядоўным падпарадкаваннем (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Сорак маленькіх чалавечкаў былі гатовы запомніць не толькі тое што скажа настаўніца але ўсё што яна будзе рабіць.

2. Тут паўзіраўшыся на статуі з белага мармуру што стаяць ля вады я пайшоў правым бокам далей зважаючы на пастаянную перамену краявідаў.

3. Трывожна білася сэрца калі я стаяў пад грушаю-дзічкаю адзін сярод чыстага поля мокры да апошняга рубца і глядзеў як усюды падымаецца прыгнутая дажджом зеляніна

4. Уявіў як ён стары чалавек будзе бегчы віхляючы паміж дрэў прадзіраючыся праз малады калючы ельнік каб схавацца.

5. Асабліва гэта адчувалася перад заходам сонца калі можна было падумаць што ў свеце не існуе нічога акрамя птушынага свісту і шчэбету.

***Варыянт 2***

1. У народзе кажуць што жаваранак часам спявае так што ад песні ў яго разрываецца сэрца.

2. Рыбак адчуваў што неўзабаве пачнецца раніца і што вельмі проста цяпер не паспець.

3. Куды яны пайшлі ніхто мусіць не ведаў бо нічога пра гэта не гаварылі.

4. Калі траплялася травінка якая моцна трымалася ў зямлі сарока перакусвала яе дзюбай.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. Васіль не згінаючыся каб не паказаць быццам нешта здарылася агледзеў касу і супакоіўся.

**21. Адзначце складаназалежныя сказы з сузалежным аднародным і неаднародным падпарадкаваннем (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Турсевіч разважаў аб тым што ўсё што паложана праграмаю ён даўно праштудзіраваў і што ўжо гатовы здаваць экзамены.

2. На другі дзень пасля таго як прачнуўся Лабановіч каля школьнага ганка ўжо стаяла фурманка дзядзькі Нічыпара Кудрыка таго самага што жыў у канцы сяла і які першы раз прывозіў настаўніка ў Верхань.

3. Як пойдзе жыццё яго далей што станецца з ім у наступныя дні як паставяцца да яго ўсе знаёмыя і прыяцелі калі ён застанецца без службы ў гэтым і заключаецца цікавасць.

4. За бярэзнікам чыстым светлым які расце тут з даўніх часоў у якім кожнае лета мы збіраем суніцы раскінулася поле дзе ўжо другі дзень працуюць камбайны.

5. У лесе было так добра і ціха што нават прыкрая прыгода з якой Лабановіч ужо звыкся і якая зараз была ў мінулым адышла на задні план.

***Варыянт 2***

1. І сама вузенькая сцежка па якой ён ішоў і прыдарожныя травы і кветкі і гэты духмяны кмен прыгадалі Лабановічу зараз ужо досыць далёкае дзяцінства калі ён хадзіў па такіх жа сцежках адзін ці з маці і калі ён не меў у сэрцы ніякага клопату.

2. Інстынкт самазахавання штурхаў яго на такі шлях бо настаўнік быў упэўнены ў тым што так ці іначай яму прыйдзецца мець справы з начальствам што трэба будзе даваць нейкія тлумачэнні.

3. Турсевіч меркаваў што прыяцель якога ён напалоханы збіраўся пакінуць ужо абудзіўся і што яны па шчырасці пагавораць аб сваіх справах.

4. Паглядзеўшы у той бок куды толькі што паехала машына Пятро падумаў што напэўна хутка пойдзе дождж бо адтуль насоўвалася хмара і ўзняўся вецер.

5. Кусты бэзу якія мы з бацькам калісьці садзілі і якія цяпер радуюць прыемным водарам так разрасліся што не адразу можна ўбачыць хату.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

**22. Адзначце складаназалежныя сказы са змешаным падпарадкаваннем (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Цяпер я быў упэўнены што мая рабіна будзе жыць да таго часу пакуль будзе ведаць што ў свеце ёсць чалавек каму яна патрэбна які клапоціцца пра яе для каго ёй варта жыць.

2. Як праз верхавіны соснаў працэдзяцца промні і на іголіцы заварушацца рыжыя сонечныя плямы між пажоўклага лісця можна ўбачыць як выскоквае з зямлі сон-трава.

3. Круглы двор сялянскай сялібы заўсёды быў гасцінным месцам дзе збіраліся вясковыя рамёствы дзе таленавітыя рукі нашых прашчураў мудравалі тое што неабходна гаспадарцы.

4. Без грыбоў Іван ніколі не вяртаўся таму што добра ведаў памятаў мясціны дзе збіраў раней і якія паказаў яму бацька яшчэ ў дзяцінстве.

5. Убачыўшы ўнізе рэдкі ланцужок агнёў які адкрыўся з узгорка Андрэй адчуў што сэрца забілася мацней душу агарнула пачуццё радасці і незразумелай трывогі.

***Варыянт 2***

1. Лета пахне для мяне печанымі на кастры каласамі ў якіх зерне яшчэ мяккае і салодкае свежым сенам якое яшчэ зусім нядаўна было травою і якое не паспела запыліцца ў пунях.

2. Ён расказаў што ў міжпланетнай прасторы лятае безліч метэарытаў і што ёсць такія касмічныя прамяні якія небяспечныя для жыцця.

3. Той каму быў час і ахвота прыглядацца хто лепш бачыў Ганну заўважаў што перамянілася яна не толькі з аблічча.

4. Я з самага дзяцінства марыў пасадзіць якое- небудзь дрэўца каб потым ведаць што яно мае каб расці разам з ім.

5. Кожнага разу калі на вока пападаўся камень пры дарозе Сцяпану здавалася што гэта той камень які ляжаў некалі пры парозе бацькоўскай хаты.

**23. Суаднясіце сказы са схемамі. У схемах не ўказаны сродкі сувязі. Адказ напішыце ў выглядзе спалучэння лічбаў і літар:**

***Варыянт 1***

1. Настаўнік, яшчэ зусім малады хлопец, які нядаўна прыехаў у першую сваю школку ў глухой палескай вёсцы, ледзь-ледзь усміхнуўся сам сабе, пэўны ў тым, што старая няіменна раскажа пра здарэнне з нячыстай сілай.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. З раніцы ў сад зляцеліся пчолы, бо аблюбавалі нашу яблыню, маладзенькую, стройную, якая лашчыць вока пяшчотным бела-ружовым колерам і якая разлівае свой водар на ўсё наваколле.

3. На ўсім ляжала пячаць нядбаласці і нейкай недаробленасці, як быццам тутэйшыя гаспадары будаваліся на скорую руку, рабілі ўсё да часу і як быццам яны яшчэ не ўправіліся даць той лад і парадак, якім наогул адзначаецца беларуская вёска.

4. Маладыя бабры, якія выраслі ў няволі і былі потым выпушчаны ў раку, адразу пачынаюць будаваць сабе дом, які нічым не адрозніваецца ад таго, што будуюць вопытныя бабры.

5. Хоць амаль што не каля кожнай хаты ляжалі кучы бярвенняў і гнілі, нікому не прыходзіла ў галаву думка палажыць кладачку хоць супраць свае хаты, каб можна было прайсці праз балота, у якім тапілася гэта вуліца.



***Варыянт 2***

1. У нядзельку раненька, ледзь толькі зайграла чырвань на ўсходзе, Лабановіч сядзеў ужо на сене ў драбінах і выязджаў з вёскі, невялічкай, у адну вуліцу, якая выглядала непрыветна і непрытульна.

2. Можа, гэтую асцярожнасць бяроза пераняла ў дуба, бо той усё ніяк не асмельваўся скінуць сваё старое пажоўклае ўбранне, усё чакаў, пакуль добра ўгрэе сонца і адыдзе ад холаду карэнне.

3. Дзе б я ні быў, куды б ні закінула мяне доля, не-не ды згадваю той куток, куды я заўсёды вяртаюся з блізкіх і далёкіх дарог.

4. Вясной на гэтых астравах з яловым і змешаным шыракаліставым лесам, у якім пераважаюць сярод іншых дрэў дуб, ясень і клён, заўсёды сустракаюцца дзікі, якія з надыходам восені перабіраюцца ў лясы, адкуль робяць часам начныя налёты на вясковыя палеткі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

5. *Яму* было прыемна пачуваць, што ён цяпер у гэтым цёплым і прытульным пакоіку, дзе прыветна і мнагазначна гарыць лямпа пад белым абажурам, дзе ўсё так ціха і спакойна і нішто не перабівае думак.



**24. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску трэба паставіць коску:**

***Варыянт 1***

1. Па суседстве стаяла тоўстая бяроза ў развілцы_ якой было глыбокае дупло.
2. У той жа Белавежы я пабачыў дуб-волат_ якому больш за чатыры вякі.
3. Васіль шоргае лыжамі насы_ якіх глядзяць у адзін правы бок.
4. Ён доўга сядзеў і назіраў за мурашкамі-працаўніцамі_ якія праклалі сваю дарожку і снавалі па ёй, цягнучы то травінку, то лісток.
5. Без компаса, ведаючы арыенціры, можна вызначыць_ дзе поўнач ці поўдзень.

***Варыянт 2***

1. Ён хацеў вярнуцца назад, туды_ дзе было так вольна і шчасліва.
2. На ўсходзе возера Нарач злучаецца вузкім пралівам між пясчаных кос з возерам Мястра плошча _якога – трынаццаць квадратных кіламетраў.
3. Хутка хмара, аддаўшы зямлі належнае, пасвятлела, разарвалася на шматкі_ што паступова раставалі ў небе.
4. Лес жыве сваім таямнічым жыццём пазнаць_ якое можа не кожны.
5. Маці знарок паклала перад Валодзькам аладку і кавалачак рудога сала, зірнуўшы на _якое ён не ўтрываў і на час адстаў ад брата.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**25. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

***Варыянт 1***

1. Толькі калі знямогся зусім, калі бяссільныя рукі апусцілі страшэнна важкую касу і не маглі ўжо скрануць, уваткнуў кассё ў купіну, падаўся да калёс.

2. Пэўна, птушка вырашыла, што дом яе выяўлены, і заставацца дзецям у ім небяспечна.

3. Дразды нават і не маглі падумаць, што зязюля цішком падкіне ў іх гняздо яйка, што ім давядзецца даглядаць і карміць чужое дзіця.

4. На другі дзень, як толькі чырвонае сонейка выглянула з-за высокіх гор, і птушкі зашчабяталі на кусце бэзу, Валерка прачнуўся і адразу ж выбег на двор.

5. Я люблю часіну навальніцы, калі б'е пярун на ўсе лады і калі злуюцца ў хмарах бліскавіцы.

***Варыянт 2***

1. У красавіку, калі стала прыграваць сонейка, калі зямля пачала выглядваць з-пад снегу, ля сядзібы ўбачылі сляды мядзведзя.

2. Справа была позняй восенню, калі цямнее рана і вечары доўгія.

3. Паўлюк падняўся тады, калі рэдкая начная цемра неўпрыкмет растварылася, і ўсё афарбавалася ў блакітна-малочны колер.

4. Беларусь сёння славіцца здабыткамі, якіх ніколі раней не мела, і якія сталі магчымымі ў выніку стваральнай працы народа.

5. Мяне ўжо радуе і тое, што ночка стала ўбываць і што ад мёртвага спакою пачне прырода ажываць.

**26. Адзначце складаназалежныя сказы, у якіх на месцы пропуску (пропускаў) трэба паставіць коску (коскі):**

***Варыянт 1***

1. Кажуць, што_ калі паглядзіш чалавеку ў вочы, то ўбачыш схаванае на дне яго душы.

2. Кветка, нахіленая ў бок святла, улюбёна падстаўляла сонцу свае чатыры шырокія глянцавітыя пялёсткі, на краі аднаго_ з якіх іскрылася, гатовая вось-вось упасці, чысцюткая, як сляза, кропля.

3. Вокны, што выходзілі на вуліцу _ насцярожана маўчалі.

4. Аленка казала, што _ калі раніца будзе цёплай, пойдзем па шчаўе.

5. Як прыемна _ дзе б ты ні быў _ пачуць роднае слова!



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт 2***

1. Самай галоўнай крыніцай, адкуль чалавек чэрпае свае веды _ з'яўляецца і сёння кніга.

2. Паветра здавалася настолькі чыстым, што _ калі б праляцела птушка, то, відаць, быў бы чуваць шэлест яе крылаў.

3. Колькі б ні думалі _ лепшую за хлеб ежу цяжка прыдумаць.

4. Жыта, між сцяблін _ якога цякла празрыстая цішыня, шаптала ціхім летнім шумам.

5. Вядома, што _ калі янота даганяюць і паратунку няма, звярок абараняецца мужна і заўзята.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ

**1. Адзначце бяззлучнікавыя складаныя сказы (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. З куста ядлоўцу адарваліся дзве шаўкавіста-срэбныя павуцінкі паплылі да чародкі бярозак.

2. Над лясамі і балотамі клубіўся густы халодны туман буйная раса вісела на прыдарожнай траве.

3. Недзе ўгары свяціла негарачае сонца вершаліны елак ціха гарэлі ў ягоных бліскучых промнях.

4. Вунь відаць тая глухая сцежачка якою ён любіў бегаць раніцаю ў грыбы.

5. Да твару прыліпала мокрае павуцінне за каўнер сыпалася ігліца.

***Варыянт 2***

1. Дні стаялі пагодлівыя сухія ночы цёплыя з густымі зоркамі на цёмна-сінім і нязвыкла далёкім небе.

2. Найбольш моцныя і выразныя гукі даляталі ў бліндаж перашкаджалі сну байцоў.

3. Дыхалася вольна на ўсе грудзі паветра было чыстае настоенае на пахах траў і красак.

4. Пры ўзлесках амаль усюды стаялі калёсы завіхаліся людзі.

5. У прыродзе склалася так што жнівень сустракаецца з восенню.

**2. Адзначце бяззлучнікавыя сказы, у якіх тры прэдыкатыўныя часткі (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Застываюць ручайкі на дарогах лужыны зацягваюцца празрыстым лядком паблiскваюць узорамі крохкія крышталікі.

2. Ад сцюдзёных подыхаў ветру замерзла лясная рачулка застыла балота каля берагоў возера заблішчаў лёд.

3. Вецер настойліва гнаў з неба нізкае ашмоцце хмар шмат дзе ў вышыні блішчалі прагалы блакіту з беражкамі далёкіх белых аблокаў.

4. Ранішняе ліпеньскае сонца мяккімі хвалямі каціласа на надрэчную вёску хвалі збягалі да вады і збіраліся ў рачным люстры сляпілі вочы.

5. Ціха патрэсквалі галінкі ў вогнішчы недзе за балотам крычаў драч працяглая песня даносілася з Прудзішчаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт 2***

1. Ноч зямельку агарнула лісцік дрэмле спіць трава.

2. Дзесьці ўдалечыні пачуліся глухія раскаты грому неўзабаве яны наблізіліся зрабіліся больш гучнымі і працяглымі.

3. Зялёны полаг дрэў пранізваюць промні безліч сонечных зайчыкаў бегае па зямлі.

4. Пачыналі выбіраць бульбу лістота ўбіралася ў вераснёва-кастрычніцкі колер на гарышчы пахла штрыфелямі і антонаўкамі.

5. Меншымі становяцца дні няма ўжо таго цёплага надвор'я нізіны і вадаёмы раніцай хавае туман.

**3. Адзначце бяззлучнікавыя сказы, у якіх паміж часткамі трэба паставіць коску:**

***Варыянт 1***

1. Стары бабёр з палёгкай уздыхнуў след вады не падмане, выведзе да большай вады.

2. Задыміўся нагрэты сонцам асфальт уздоўж тратуараў пацяклі шумлівыя, у вясёлых бурбалках ручаі.

3. На загуменні ў золата ўбіраюцца бярозкі барвянымі хусцінкамі ўпрыгожылі сябе асінкі.

4. Здымае пробу з грэчкі пчолка сінее ў жыце васілёк.

5. Цераз поле не перайсці ногі грузнуць у зямлі, нібы ў цесце.

***Варыянт 2***

1. Мара Рыгора Раманавіча Шырмы здзейснілася беларуская народная песня загучала на самых вядомых сцэнах Еўропы.

2. Мне было радасна я зноў вярнуўся на лета ў вёску.

3. З кожным днём у полі чулася ўсё больш і больш людскіх галасоў гулі машыны.

4. Задуменна і самавіта шумяць меднаствольныя сосны амаль марской хваляй б'юць у бераг азёры на поўначы нашай рэспублікі.

5. У нізінах яшчэ вее халадком на ўзгорках добра прыгравае сонца.

**4. Адзначце бяззлучнікавыя сказы, у якіх паміж часткамі трэба паставіць працяжнік:**

***Варыянт 1***

1. Агонь весела ліжа сухія бярозавыя сукі водбліскі полымя скачуць па сценах.

2. І нявопытнаму воку было відаць чалавек робіць не сваю справу.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. З дзяцінства памятаю ніколі мы не праміналі гэтай чароўнай асенняй пары.

4. Мяняецца пара года мяняецца праца.

5. Мы ўжо не просім міласці ў прыроды прырода моліць літасці ў нас.

***Варыянт 2***

1. Не дораг абед дораг прывет.

2. Сядзець у Верхмені не выпадала пачыналася самая гарачая пара ў гаспадарцы.

3. Ранак луг расой купае дзень гарачы будзе.

4. Мы знаем у нашай краіне няма непрыгожай зямлі.

5. Кружыліся і прыпадалі да вады азёрныя чайкі шумелі і набягалі на бераг хвалі.

**5. Адзначце бяззлучнікавыя сказы, у якіх паміж часткамі трэба паставіць двукроп'е:**

***Варыянт 1***

1. Ён ведае хутка з-за сіняга лесу адразу і раптоўна гайданецца над азярынкамі і серабрыстымі плёсамі сонца.

2. Праз хвіліну нечакана ўбачыў стаіць матуля ў жыце крыху воддаль ад сцежкі.

3. Кветку-званочак крані песні пальюцца адтуль жаўрукова.

4. Я люблю бываць у Бярэзінскім запаведніку тут можна гартаць жывыя старонкі Чырвонай кнігі.

5. Зазелянелі паплавы накінулі на сябе летнія ўборы дрэвы.

***Варыянт 2***

1. Лемяшэвіч гутарыў з Аксінняй невыпадкова такі намер з'явіўся ў яго даўно.

2. Апаласні твар халоднай вадой сон як рукой зніме.

3. Я ведаў здаўна яблыні, як кветкі, без чалавечай любові расці не будуць.

4. Гэта азначала трывогу чалавек знаходзіцца блізка.

5. Пакой раз-пораз заліваўся мігатлівым водбліскам маланкі непадалёк грымела гулка, раскаціста.

**6. Адзначце нумары бяззлучнікавых сказаў, у якіх знакі прыпынку паміж часткамі пастаўлены правільна:**

***Варыянт 1***

1. Па-над рэчкаю лён адцвітае блакітам, аддае вам паклон буйным коласам жыта.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Запяеш па душы, дасі ўцехі гасцям: поўны гуслі насыплю дукатаў.

3. І нечаспадзявана адбылося незвычайнае: у жнівеньскім росквіце рабіна заружавела, зазырчэла яркім хараством, гарачым полымем агністых гронак.

4. Лабановіч адчуваў вялікае маральнае задавальненне – вучні займаліся дружна, старанна.

5. Бор стары завые нудна – зашуміць галлём лаза.

***Варыянт 2***

1. Вецер загуляе – хвойнік, лозы гнуцца.

2. На стрэхах дыні познія даспелі, фасоля парыжэла ля акна.

3. Нас турбавала адно – чым закончацца агледзены.

4. Сінеўся бор, цякла вада: скрозь пахла мёдам і травою.

5. Прабег полем, расхінаючы рукамі каласы, потым зноў прыслухаўся: нідзе нічога не чуваць.

**7. Адзначце бяззлучнікавыя сказы з пунктуацыйнымі памылкамі:**

***Варыянт 1***

1. У маленькім Антосевым садку ў гэтую пару вясны было надзвычай хараша: белапенная квецень аздобіла кожнае дрэўца.

2. За вокнамі мільгалі бярозы, у вагон залятаў лугавы вецер бегла за цягніком сонца, высвечваючы залацістыя палі збажыны.

3. Будзе дождж – будзе хлеб на стале не будзе дажджу – не будзе ні ягад, ні грыбоў, ні арэхаў, ні садавіны і гародніны.

4. Тут чуліся галасы людзей, трывожна брахалі сабакі, гулі машыны, крычалі гарластыя пеўні.

5. Дыхнула вясна: і зямля стала вясёлая.

***Варыянт 2***

1. На крылах цёплых вятроў прылятала з-за мора зялёная вясначараўніца: лясы першыя дружна адгукаліся на яе малады покліч.

2. Не паспела я пераступіць парог кабінета – на стале дзынкнуў унутраны тэлефон.

3. У Косціка была яшчэ і свая забаўка – ён цалюткімі днямі выседжваў дзе-небудзь у зацішку, прыслухоўваючыся да спеваў лясных жаваранкаў.

4. У людзей склаўся класічны вобраз дуба – галінастае дрэва з таўшчэзным камлём і густой шапкай-кронай.

5. Яшчэ не хадзілі трамваі, тралейбусы, вуліца, была пустая і мокрая ад дажджу.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

**8. Адзначце нумары бяззлучнікавых сказаў, якія адпавядаюць наступнай схеме: [...]:[...],[...] (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Бацька спачатку пратэставаў пасля махнуў рукой няхай хлопец прывыкае да гаспадаркі.

2. Лета гэта воз казытлівага непаслухмянага сена збольшага ўвязаны і ўціснуты жэрдзю ехаць жа недалёка неяк давязём.

3. З туманам пачынала пахнуць дымам за лета высахла скошанае балота гарэў торф.

4. Усё нібы змянілася ўвачавідкі рунь пагусцела стала больш красак на ўзмежку.

5. Прабег полем расхінаючы рукамі каласы потым зноў прыслухаўся нідзе нічога не чуваць.

***Варыянт 2***

1. Торф тушылі ўсё лета і не маглі патушыць ён тлеў глыбока ў зямлі не заліць вадой.

2. Чарэшня была зусім немаладая стаў маршчыністы ствол пасохлі ніжнія сукі.

3. Дуб быў непадуладны часу ён не гніў у вадзе яго не браў шашаль не шкодзілі яму ні вецер ні сонца.

4. Хлопчык не адставаў ад бацькавага памочніка ні на крок хадзіў з ім на поле ў лес напрошваўся разам ездзіць на начлег.

5. Я маляваў сабе цікавыя карціны мы будуем дом хтосьці працуе ў полі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ

**1. Адзначце сказы з рознымі відамі сувязі:**

***Варыянт 1***

1. Пачуццё павагі да прадпрыемства і здзіўлення перад тым, што там вырабляецца, авалодала Аленкаю, калі яна ішла з маці на завод.

2. Ледзь маці ўправілася сказаць дзядзьку Цімоху, што, мусіць, будзе задуха, як Васіль, тузануўшы каня лейцамі, чапляючы калёсамі за нізкае галлё падлеску, порстка аб'ехаў Чарнушкаў, пакінуў ззаду.

3. Яшчэ сон звівае павекі, іх цяжка разарваць, і галава яшчэ зусім не прачнулася, то разрываючыся да яснаты цвярозага азарэння, то патанаючы ў салодкім тумане забыцця.

4. Гліна, у якой многа вільгаці, тлустая, а гаршчок з такой гліны, сохнучы, трэсне на сонцы і ў цяні.

5. Варта было толькі азвацца недзе далёка восені, як вавёрка кідала гульні і бралася за работу, у першую чаргу яна рамантавала сваю хатку, высцілала яе цёплым мохам.

***Варыянт 2***

1. Прытуліла я лісточак падбелу да шчакі – і так спакойна, утульна стала, нібы душа чакала гэтай цеплыні.

2. Адступалі балоты і на заходнім баку, дзе рунелі ці жаўцелі да краю лесу палі, таксама скупыя, няўдзячныя, хоць у іх глебе і было менш пяску.

3. Штосьці сціскала сэрца, не дазваляла вольна дыхаць, і на нейкае імгненне яму здалося, што ў яго ад вялікай радасці круціцца галава і сэрца вось-вось перастане біцца.

4. Тут калісьці стаяў Адам Міцкевіч, і ўсё, што ён бачыў, клалася на яго сэрца.

5. Лета для мяне яшчэ там, у дзяцінстве, прапахла альховай карою, з якой мы рабілі лубкі для ягад, суніцамі, малінаю ды чарніцамі, якімі пахлі нашы рукі, вусны і нават шапкі, у якіх заўсёды аставаліся пачарнелыя крапінкі ад ягад.

**2. Адзначце сказы, у якіх часткі звязаны злучальнай і падпарадкавальнай сувяззю (коскі ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Зірнула з усмешачкай і Васілю здалося што з яе язычка зноў сарвецца штосьці крыўднае.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Алег уявіў сабе як яго там усе шукаюць як хвалюецца маці і яму прыкра стала ад гэтай думкі.

3. Каб пасадзіць дрэва трэба мець дужыя чулыя да маладога параст-ка рукі і зусім нічога не трэба каб ссекчы дрэва.

4. Канчалася лета надыходзіла дажджлівая восень і непрыкметна гаспадыняй на баравых абшарах станавілася зіма.

5. Бывае так што лес маўчыць бывае што ніводзін ліст не скалыхнецца.

***Варыянт 2***

1. Ганна сціпла маўчала але яму бачылася што яна таксама не рада такому таварыству.

2. Кінуўшы траву маці зірнула на яго і Васіль заўважыў як на твары яе з'явілася шкадаванне.

3. Сонца ўжо схаваецца за гарою павее свежасцю з крынічных яроў а па лузе ўсё яшчэ гуляюць цёплыя ўсмешкі.

4. У цемры постаць яе ледзь значыцца а твару і зусім не відаць але Васіль ведае гэта яна.

5. Андрэй глядзеў на маці і нечакана яму прыйшла ў галаву думка што ўпершыню бачыць яе вось так блізка.

**3. Адзначце сказы з бяззлучнікавай і падпарадкавальнай сувяз-зю (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Перад медзведзянятамі ў місцы стаяла малако ляжалі кавалкі цу-кру але яны да ежы не дакраналіся.

2. Шмат чаго ў палешукоў ад буслоў шмат чаго і ў гэтых птахаў у белых світках ад людзей што жывуць у палескім краі.

3. А можа зоркі робячы гэтыя дзіўныя рухі спявалі там свае песні але голас песень не мог даляцець да зямлі з бяздонных глыбінь бо зоркі былі вельмі далёка ад яе.

4. Пад дубамі паблізу якіх растуць бярозы асіны кусты вербалозу снег лыжаў не трымае яны кожны міг правальваюцца.

5. У кожнага дрэва пагудка свая якой яно ўслаўлена ўсцешана і толькі над Нарач\чу недзе мая забытай сумуе алешына.

***Варыянт 2***

1. Рыпіць пад нагамі снег звініць твой вясёлы смех і месяц над намі вісіць як падкова.

2. Апошні раз расступіўся лес і перад вачамі настаўніка раскрылася шырокая круглая палянка якая была вясёлая і прыветная.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. І вось аднойчы чаканне было ўзнагароджана мы ўбачылі шпака які сеў на нашу шпакоўню.

4. Васіль не даў ніякай увагі гэтым астраўкам яго больш цікавіла што на балоце было яшчэ многа вады.

5. Я з тых краёў куды буслы вяртаюцца я з тых палёў дзе кветак не злічыць.

**4. Адзначце сказы з бяззлучнікавай і злучальнай сувяззю (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. Салаўі спявалі напрадвесні звінелі на цымбалах капяжы і жніўная зажураная песня кранала струны кожнае душы.

2. Ты не вечны чалавек не так у цябе многа часу і думак добрыя запасы ты ў доўгі не кладзі засек.

3. Калі дзяцел паляцеў я падышоў да пня цікава было глянуць што ён там рабіў.

4. Ён адчуваў што ззаду стаіць маці пазірае ўслед ласкавая і гордая і ад гэтага ў руках і нагах сілы большала.

5. Усе мы з хат усе мы з цішыні і ўсе мы з матчыных далоняў.

***Варыянт 2***

1. Дол засланы шышкамі цвіце сунічнік перагукваюцца птушкі і ўсё тут знаёмае.

2. Стракочуць у лузе конікі гудуць над кветкамі пчолы ляшчыннік арэхі гушкае ды звініць ручаёк тоненькі.

3. Кароткія яшчэ ў жніўні ночы вечар ледзь не сустракаецца са світаннем а трэба даць уціхнуць зморы ў руках.

4. Гэтыя малюнкі тамілі вочы і засмучалі сэрца і чалавек мімаволі стараўся знайсці нешта такое на чым можна было б адпачыць і заспакоіцца.

5. Часам настрой чалавека сугучны настрою які пануе ў прыродзе але бывае і наадварот.

**5. Адзначце сказы з рознымі відамі сувязі, у якіх чатыры прэдыкатыўныя часткі (знакі прыпынку ў сказах не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

1. У вестыбюлі было шумна ішлі яны хутка але Аленка паспела заўважыць і медыцынскі пункт на другім паверсе і адчыненыя дзверы сталовай і нават тое што на кожным століку там стаяць у чырвоных вазах невялічкія букеты рамонкаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. У гарадах на станцыях якія праязджаў ён бачыў як кіпіць і будуецца новае жыццё а тут усё тое што было шэсць гадоў таму назад.

3. Бывае што памылішся канец лета пажоўклыя лісты ўсцілаюць зямлю.

4. Янка сядзеў ля вогнішча і яму здавалася што вось на ўзлеску дзе расце папаратнік зараз бліcне цудоўная кветка што прынесла багацце і гора беднаму Янку.

5. Туман шчыльна абляпіў сасну і яна ўжо не скардзілася не стагнала а слаба і задаволена ўздыхала і чутно было як зняможана шамацелі яе галінкі.

***Варыянт 2***

1. На адно кароткае імгненне адчуваю сябе дзесяцікласнікам і здаецца мне што завітаў у школу ўзяць падручнікі і не ўцярпеў зайшоў паглядзець дзе буду вучыцца і канечне прыгледзець сабе парту.

2. Доктар хуценька пацёр нечым халодным Міколкаву руку і праз момант хлопчык адчуў як у тым месцы дзе доктар пацёр нібы пеканула пчала.

3. Усё на сваім месцы быць павінна лілеі ў рэчцы на імшарах журавіны рабінка родная каля паркана а салавей які бярэ любую ноту спяваць павінен закаханым.

4. Няясныя вобразы ўсплывалі самі сабой аб чымсьці казалі і клікалі невядома куды а на сэрцы аставалася пачуванне ўтраты чагось далёкага чаго ўжо не вернеш ніколі і аб чым можна толькі ўспамінаць.

5. Цяпер калі Віктар разам з дарогаю ўвайшоў пад шаты лес які за гэты час павышэў і пастарэў здаўся яму чужым у ім ён не ведаў ні дрэў ні кустоў ні сцежак якія пратапталі ўжо без яго.

**6. Адзначце сказы з рознымі відамі сувязі, у якіх прапушчана двукроп'е:**

***Варыянт 1***

1. Будзе дождж шапацець, будзе снег завірушны кружыцца, і вясны белы дым зноў сады ахіне будуць травы цвісці, будзе падаць лістота з імжыцай.

2. Выраз яе цёмных акруглых вачэй часта змяняўся часам у іх іскрыўся вясёлы смех і нахіл да жартаўлівасці, то адбівалася нейкае засмучэнне і тая сталасць, што рабіла ўражанне, быццам дзяўчына многа перадумала і перажыла.

3. І дарэмна малады бліскучы месячык стараецца ажывіць пагаслыя вочы дома яны свецяцца, а жыцця няма.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. У тым месцы, дзе рэчка рабіла паварот і гублялася ў глухіх зарасніках, ён глянуў убок і застыў ад здзіўлення на невялічкай палянцы цесным колам стаялі зубры.

5. Хлопец праз туман убачыў прыгожую дзяўчыну хацеў па-вайсковаму павітацца, але нічога не атрымалася, бо языку было цесна ў роце.

***Варыянт 2***

1. Балоты скончыліся дарога пашыбавала на горку, калёсы мякка пакаціліся па жоўценькім пясочку, і лес прыняў звычайны свой выгляд.

2. Дарога пачала паніжацца сыпкі пясок яе змяніўся мяккім, падатным забалочаным грунтам, на якім вырэзваліся дзве чорныя вільготныя каляіны.

3. Гляджу даспелы ліст зрываецца з галінкі ад лёгкага подыху ветру, трапечацца, як матылёк, і ціха кладзецца ён у верасовую пасцель.

4. Іду, бо нехта ж павінен ісці дарогі не могуць, каб па іх не хадзілі.

5. Я націскаў на педалі, чуючы, што за спінай вуркоча гром, але ўсё роўна ўцячы ад дажджу не ўдалося дарога скрозь вузкая, каранiстая, і шмат дзе трэба было каціць веласіпед.

**7. Адзначце сказы з рознымі відамі сувязі, у якіх усе знакі прыпынку пастаўлены правільна:**

***Варыянт 1***

1. Жэрдкі абчэсваліся збольшага, сядзець на іх было мулка, але яшчэ горш было пісаць – ручкі і алоўкі правальваліся ў шчыліны, чарніліцы куляліся, заліваючы паперу і кніжкі.

2. Дождж парадзеў, неўзабаве з блакітнага прасвету выглянула сонца, і над Дзвіной, злучаючы яе берагі, паўстала казачна яркай дугой у сваіх сямі колерах вясёлка.

3. Даніла, які тут ведаў усе закуткі, неяк дзіўна круціў, то ішлі алешнікам, то, зрабіўшы дугу, улезлі ў роў, выбраліся на яго круты бок і зашыліся ў дробненькі, але густы беразняк, нібы апырсканы зялянінай першых лісточкаў.

4. Травы пахнуць кветкамі, кветкі пахнуць зорамі, а зоры над палеткамі – лесам і азёрамі.

5. Яловы лес, дзе я іду, цёмны, густы, калматыя лапы елак шчыльна і нізка прыкрываюць зямлю, і яна пад імі голая, сырая, бястраўная.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***Варыянт 2***

1. Ведаю: скончацца спевы вясновыя, сустрэну лета і восень, але песні зімовага лесу не забуду ніколі я.

2. Васіль знарок адвярнуўся, каб не глядзець у яе бок, але міма яго ўсё ж не прайшло ні тое, што яна рабіла, ні тое, як яна зірнула на яго.

3. Наляціць, бывала, дзятлава сям'я на дрэва: учэпяцца маладыя дзятлы лапкамі за шурпаты ствол, а стары дзяцел аглядае з усіх бакоў дрэва.

4. Зайчанятка не ведала, дзе яму лепш схавацца ад небяспекі – ці яно павінна зліцца з лапікамі снегу, ці стаць слупком за якое-небудзь дрэўца.

5. Антонаўкамі свеціцца стары калгасны сад, і днямі яшчэ леціцца, хаця ўжо лістапад.

**8. Адзначце сказы з рознымі відамі сувязі з прапушчанымі знакамі прыпынку:**

***Варыянт 1***

1. У каляінах часта віднеліся вылузганыя жылы карнявішчаў, было многа ям і калёсы амаль увесь час падскоквалі, моцна хісталіся з боку на бок.

2. Сяргей Фёдаравіч ведаў, што падыходзіць блізка да зуброў небяспечна: могуць падняць на рогі.

3. А потым неспадзявана моцна рвануў вецер і абрынулася на зямлю ўсё разам: цемната, і суцэльная сцяна вады, і святло сіняватых ад лютасці маланак, і ўдары грому, ад якіх хацелася сцяцца ў маленькі камячок, бо здавалася, што ты толькі адна засталася на ўсім белым свеце.

4. Недалёка сонна крыкнула вадзяная птушка, зашалясцела ў траве, ціха, нібы незадаволена, азвалася на яе крык за трыснягом другая і зноў усё супакоілася.

5. Сонца ўжо схаваецца за гарою, павее свежасцю з крынічных яроў, а на лузе ўсё яшчэ гуляюць цёплыя ўсмешкі.

***Варыянт 2***

1. Любавацца дзікай прыгажосцю няма калі: трэба некуды прабівацца, каб хоць выйсці з гэтае гушчэчы.

2. Лёгкая прыемная хваля падхоплівае, нясе, нібы на крылах і ў гэтыя моманты знікае адчуванне часу, прасторы, душа нібы зазірае ў вечнасць.

3. Калёсы спыняліся яшчэ разы тры, і кожны раз то маці, то брат загадвалі вярнуцца, не на жарт абяцалі набіць, і, можа, Валодзька



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

адолеў бы сваё вялікае хаценне, калі б не ўбачыў, што на другім возе, які выехаў услед з сяла сядзіць разам з бацькам яго найбліжэйшы прыяцель, супольнік ва ўсіх шкодах, Хведзька.

4. Чуваць, як дыхае вераснем зара па ўсёй зямлі, што ў вечаровым дыме і добра нам маўчаць і пазіраць на родны край вачыма маладымі.

5. Даўно павыгаралі, павыліналі кветкі, трава, дрэвы, паблякла нават неба, і ўсё гэта, здавалася, было цяпер аднаго рыжага колеру, як сонца.

**9. Адзначце схему, якая адпавядае наступнаму сказу (знакі прыпынку ў сказе не пастаўлены):**

***Варыянт 1***

Адразу прыходзіць радасная прасветласць на ўсё пачынаеш глядзець інакшымі вачыма і здзіўляешся што ў гарадскім тлуме прапускаеш праходзіш міма і не заўважаеш як свежа блішчыць пасля дажджу трава што несамавітая рэдзенькая бярозка якая расце пад акном гожая і зграбная і што вакол і сонца і вецер і неба.



***Варыянт 2***

Усе ўважліва слухалі а рыбак з ахвотаю пачаў апавядаць пра тое што чуў ад старых людзей пра русалак якія выходзяць з возера і заманьваюць сваёй красою маладых хлопцаў пра тое што некалі на месцы возера стаяў прыгожы белакаменны горад з залатымі макаўкамі цэркваў горад Svіцязь які аднойчы праваліўся ў зямлю і на месцы якога заплюскалі азёрныя хвалі.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# АДКАЗЫ

## Складаназлучаныя сказы

| № | В – 1 | В – 2 | № | В – 1 | В – 2 | № | В – 1 | В – 2 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 1, 3, 4 | 2, 3, 4 | 5. | 2, 4, 5 | 1, 5 | 9. | 2, 4, 5 | 1, 3, 5 |
| 2. | 2, 4, 5 | 1, 2, 3 | 6. | 2, 3, 5 | 1, 4, 5 | 10. | 1, 2, 4 | 1, 4, 5 |
| 3. | 2, 3, 5 | 1, 5 | 7. | 1, 2, 5 | 1, 2, 3 | 11. | 2, 3, 5 | 1, 4, 5 |
| 4. | 1, 2 | 2, 3 | 8. | 1, 3, 4 | 2, 3, 4 | 12. | 3, 4, 5 | 1, 4, 5 |

## Складаназалежныя сказы

| № | В – 1 | В – 2 | № | В – 1 | В – 2 | № | В – 1 | В – 2 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 2, 4, 5 | 1, 2, 4 | 10. | 2, 3 | 1, 5 | 19. | 1, 3, 4 | 1, 2, 3 |
| 2. | 2, 3, 4 | 2, 3, 5 | 11. | 1, 3 | 1, 2 | 20. | 3, 4, 5 | 1, 4, 5 |
| 3. | 1, 4, 5 | 1, 3 | 12. | 4, 5 | 1, 5 | 21. | 2, 4 | 1, 5 |
| 4. | 2, 3, 5 | 1, 2, 5 | 13. | 1, 4 | 2, 3 | 22. | 1, 3, 4 | 2, 4, 5 |
| 5. | 1, 2, 4 | 2, 4, 5 | 14. | 1, 4 | 2, 3 | 23. | 1в, 2д, 3б, 4а, 5г | 1в, 2д, 3г, 4в, 5а |
| 6. | 2, 3, 4 | 1, 4, 5 | 15. | 3, 4, 5 | 1, 2, 5 | 24. | 2, 4, 5 | 1, 3 |
| 7. | 1, 2, 3 | 2, 3, 5 | 16. | 3, 4, 5 | 1, 3, 4 | 25. | 1, 3, 5 | 1, 2, 5 |
| 8. | 3, 4, 5 | 1, 3, 4 | 17. | 3, 4 | 1, 5 | 26. | 3, 4, 5 | 1, 3, 5 |
| 9. | 1, 3, 5 | 1, 2, 4 | 18. | 1, 3, 5 | 1, 2, 5 | | | |

## Бяззлучнікавыя складаныя сказы

| № | В – 1 | В – 2 | № | В – 1 | В – 2 | № | В – 1 | В – 2 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 2, 3, 5 | 1, 3, 4 | 4. | 4, 5 | 1, 3 | 7. | 2, 3, 5 | 1, 3, 4 |
| 2. | 1, 2, 5 | 1, 4, 5 | 5. | 1, 2, 4 | 1, 3, 4 | 8. | 2, 3, 4 | 1, 2, 5 |
| 3. | 2, 3, 4 | 3, 4, 5 | 6. | 1, 3 | 1, 2, 5 | | | |

## Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі

| № | В – 1 | В – 2 | № | В – 1 | В – 2 | № | В – 1 | В – 2 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | 3, 4, 5 | 1, 3, 4 | 4. | 1, 2, 5 | 1, 2, 3 | 7. | 2, 4, 5 | 1, 2, 5 |
| 2. | 1, 2, 3 | 1, 2, 5 | 5. | 1, 3, 5 | 1, 2, 4 | 8. | 1, 3, 4 | 2, 3, 4 |
| 3. | 2, 4 | 3, 4, 5 | 6. | 2, 3, 4 | 3, 4, 5 | 9. | 4 | 3 |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

# СПІС ЛІТАРАТУРЫ

Адамовіч, Я. М. Беларуская мова: у 2 ч. Ч. 2 / Я. М. Адамовіч, Н. І. Бурак, Л. М. Грыгор'ева. – Мінск : Выш. шк., 1998.

Бадзевіч, З. І. Беларуская мова: дапаможнік для падрыхтоўкі да абавязковага цэнтралізаванага тэсціравання і паступлення ў ВНУ / З. І. Бадзевіч. – Мінск: Юніпрэс, 2005.

Бадзевіч, З. І. Беларуская мова: экзаменацыйныя тэсты / З. І. Бадзевіч, Ж. Я. Белакурская, С. М. Якуба. – Мінск : Юніпрэс, 2004.

Гаўрош, Н. В. Беларуская мова: тэсты / Н. В. Гаўрош, В. У. Азарка, А. С. Васілеўская. – Мінск : Выш. шк., 2005.

Клімавец, В. П. Беларуская мова ў практыкаваннях і тэстах: дапаможнік для падрыхтоўкі да экзамену і цэнтралізаванага тэсціравання / В. П. Клімавец. – Мінск : Аверсэв, 2007.

Клундук, С. С. Беларуская мова. Усе складаныя тэмы / С. С. Клундук, Н. Р. Якубук. – Мінск : Аверсэв, 2015.

Клундук, С. С. Беларуская мова. Усе складаныя тэмы: тэорыя і практыкаванні / С. С. Клундук, Н. Р. Якубук. – Мінск : Аверсэв, 2015.

Сіўковіч, В. М. Беларуская мова: практыкум для старшакласнікаў і абітурыентаў / В. М. Сіўковіч. – Мінск : УніверсалПрэс, 2005.

Цыбульская, С. І. Беларуская мова: тэсціраванне на 100 балаў / С. І. Цыбульская. – Мінск : ТэтраСистемс, 2005.

Шкраба, І. Р. Беларуская мова: тэматычны канспект школьнага курса для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання / І. Р. Шкраба. – Мінск : ТэтраСистемс, 2011.

# ЗМЕСТ

Прадмова ..... 3

СКЛАДАНАЗЛУЧАНЫЯ СКАЗЫ ..... 4

СКЛАДАНАЗАЛЕЖНЫЯ СКАЗЫ ..... 11

БЯЗЗЛУЧНІКАВЫЯ СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ ..... 30

СКЛАДАНЫЯ СКАЗЫ З РОЗНЫМІ ВІДАМІ СУВЯЗІ ..... 35

Адказы ..... 42

Спіс літаратуры ..... 43

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучэбнае выданне

# СІНТАКСІС

## СКЛАДАНЫ СКАЗ

Практыкум

*Складальнік*
**Старавойтава** Святлана Васільеўна

Навуковы рэдактар *Г. В. Карпянкова*
Тэхнічны рэдактар *І. І. Талкачова*
Камп'ютарная вёрстка *С. А. Кірыльчык*
Карэктар *Г. В. Карпянкова*

Падпісана да друку 19.08.2021.
Фармат 60x84/16. Гарнітура Times New Roman.
Ум.-друк. арк. 2,6. Ул.-выд. арк. 2,9. Тыраж 39 экз. Заказ № 279.

Установа адукацыі "Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя А. А. Куляшова", 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/131 ад 03.01.2014 г.

Надрукавана ў аддзеле аператыўнай паліграфіі
МДУ імя А. А. Куляшова. 212022, Магілёў, Касманаўтаў, 1.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ISBN 978-985-568-829-8

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова